# Сказы з адасобленымі дапаўненнямі

**Н. І. Назарава,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
СШ № 1 г. Лепеля

**Тэма.** Сказы з адасобленымі дапаўненнямі, знакі прыпынку ў іх (урок 1-шы).

**Мэта.** Стварыць умовы для трывалага засваення вучнямі паняцця «адасобленыя дапаўненні», правіл пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з адасобленымі дапаўненнямі.

Навучальная мэта: плануецца, што к заканчэнню ўрока вучні будуць

ведаць:

- паняцце «адасобленыя дапаўненні»;
- умовы адасаблення дапаўненняў;
- правілы пастаноўкі знакаў прыпынку пры адасобленых дапаўненнях;

умець:

- вызначаць адасобленыя ўдакладняльныя дапаўненні ў структуры сказа;
- устанаўліваць марфолага-сінтаксічныя адносіны паміж удакладняльным членам сказа і членам сказа, які ўдакладняецца;
- расстаўляць знакі прыпынку ў сказах з удакладняльнымі дапаўненнямі;

Развіваючая мэта: садзейнічаць авалоданню асноўнымі спосабамі мыслення (параўнанне, аналіз, абагульненне).

## Ход урока

### I. Арганізацыйны момант. Стварэнне эмацыянальнага настрою

**Настаўнік.** Добры дзень, вучні! Старажытныя грэкі казалі : «Добры настрой – гэта палова перамогі.» Таму ўсміхніцеся адзін аднаму, і я вам жадаю сёння на ўроку атрымаць перамогу ў барацьбе за веды.

А сёння на ўроку мы працягваем працаваць з адасобленымі членамі.

- Нагадайце, калі ласка, што такое адасабленне? (адказы)

**Настаўнік.** Акрамя таго, адасабленне – гэта цікавая сінтаксічная з’ява, якая здольна ўзбагаціць мову, зрабіць яе надзвычай разнастайнай і прыгожай.

### 2. Актуалізацыя ведаў вучняў і пастаноўка мэты

<u>1. Выкананне тэста «Чацвёрты лішні».</u>

А. 1. Шуміць рака вясёлая жывая.

2. На ўскраіне сяла стаіць дзічка высокая разгалістая з буславым гняздом на вяршыні.

3. Дыхнуў густы цёплы ветрык.

4. Мора цёмна-сіняе ў рэдкіх белых карунках разбіваецца аб вялікі камень.

*Адказ: Дыхнуў густы цёплы ветрык.*

Б. 1. Як сапраўдны мастак ён працаваў многа але без спешкі.

2. На пасяджэнні я выступіў як сведка.

3. Шырокай светлай паласою нясе свае воды Дняпро любімая рака ўсходніх славян.

4. Гаспадыня жанчына жвавая і гаваркая сустрэла мяне ветліва і гасцінна.

*Адказ: На пасяджэнні я выступіў як сведка.*

В. 1.У вясковай ластаўкі ці касаткі хвост мае форму доўгіх вілачак з вострымі канцамі.

2. Максім Багдановіч выдатны паэт і крытык вылучаўся глыбокай і шырокай адукацыяй тонкім разуменнем і пачуццём паэзіі.

3. Яе сарамлівую дзяўчыну выбралі тады членам праўлення.

4.Усе дрэвы за выключэннем старога дуба ў пачатку мая выпусцілі першыя лісточкі.

*Адказ: Усе дрэвы за выключэннем старога дуба ў пачатку мая выпусцілі першыя лісточкі. (запісваем сказ на дошцы)*

- А дзе ў гэтым сказе адасабленне?
- Якім членам сказа з’яўляецца?
- Ці хапае ў вас ведаў, каб патлумачыць умовы адасаблення дапаўненняў?
- Як вы думаеце, якая тэма сённяшняга ўрока?
- Вызначце, калі ласка, задачы, якія кожны з вас ставіць перад сабой на сённяшні ўрок.

Настаўнік аб’яўляе тэму і мэту ўрока.

**3. Этап засваення новых ведаў**

1. Вучні вывучаюць матэрыял падручніка на с. 209, запаўняюць пропускі ў табліцы (на картках).

<table>
<tr><th colspan="2">Асасабляюцца</th><th colspan="2">Не асасабляюцца</th></tr>
<tr><th colspan="2">Дапаўненні</th><th colspan="2">Дапаўненні</th></tr>
<tr><th colspan="2">Значэнне</th><th colspan="2">Значэнне</th></tr>
<tr><td colspan="2"></td><td colspan="2"></td></tr>
<tr><td>Прын.<br>…<br>…<br>…<br>…<br>…<br>+ наз. (займ.) ва ўск.скл.</td><td>Удакладняльнае значэнне (уключэнне, выключэнне, замяшчэнне)</td><td>Прын. замест + наз. (займ.) ва ўск.скл.</td><td>…</td></tr>
</table>

| **Удакладняльныя спалучэнні** | | **Спалучэнні слоў** | |
|---|---|---|---|
| Словы<br>**…**<br>**…**<br>**…**<br>**…**<br>**…**<br>і інш. + часц. мовы | Удакладняльнае значэнне (сэнсавае адценне выдзяляльнасці, узмацняльнасці) | Словы **асабліва, нават, пераважна** + часц. мовы | … |

*Запоўнены варыянт табліцы:*

| ***Адасабляюцца*** | | ***Не адасабляюцца*** | |
|---|---|---|---|
| ***Дапаўненні*** | ***Значэнне*** | ***Дапаўненні*** | ***Значэнне*** |
| *Прын.* ***акрамя, апрача, замест, за выключэннем****+ наз. (займ.) ва ўск.скл. -*<br>*…* | *Удакладняльнае значэнне (уключэнне, выключэнне, замяшчэнне)* | *Прын.* ***замест*** *+ наз. (займ.) ва ўск.скл.* | *'за' -*<br>*…* |
| ***Удакладняльныя спалучэнні*** | ***Значэнне*** | ***Спалучэнні слоў*** | ***Значэнне*** |
| *Словы* ***асабліва, нават, пераважна, у тым ліку, у прыватнасці, напрыклад*** *і інш. + часц. мовы -*<br>*…* | *Удакладняльнае значэнне (сэнсавае адценне выдзяляльнасці, узмацняльнасці)* | *Словы* ***асабліва, нават, пераважна*** *+ часц. мовы* | *Не маюць удакладняльнага значэння -*<br>*…* |

2. Пытанні:

- Якія дапаўненні адасабляюцца? Якімі прыназоўнікамі яны пачынаюцца?
- У якім выпадку дапаўненне з прыназоўнікам замест не адасабляецца?
- Спалучэнні з якімі словамі адасабляюцца, калі маюць удакладняльнае значэнне?
- Калі спалучэнні са словамі *асабліва, нават, пераважна* не адасабляюцца?

3. Практ. 348 (вусна).

4. Заданне. Зварот да сказа, запісанага на дошцы. Вызначыць адасобленыя дапаўненні, расставіць знакі прыпынку. Разабраць сказ па членах сказа.

*Усе дрэвы, за выключэннем старога дуба, у пачатку мая выпусцілі першыя лісточкі.*

**4. Фізкультхвілінка**

**5. Этап выпрацоўкі навыкаў і фарміравання ўменняў**

1. Практ. 349. (1 варыянт: 1-2 сказы, 2 варыянт: 3-4 сказы).

2. Вучні дзеляцца на дзве групы

1-я група, хто правільна справіўся з заданнем, тлумачаць матэрыял тым, хто дапусціў памылкі і робяць марфемны разбор слова *награвaецца* і словаўтваральны разбор слова *глуха* (2 вучні працуюць ля дошкі).

2-я група, хто дапусціў памылкі пры выкананні задання, працуюць над 5 сказам з практыкавання 349.

3. Практ. 350. Узаемаправерка.

**6. Этап карэкцыі ведаў**

1. Карткі.

1 узровень. Адзначце нумары сказаў, у якіх набраныя курсівам словы з'яўляюцца адасобленымі дапаўненнямі.

1. Кожны пісьменнік *апрача таленту* павінен мець яшчэ права пісаць.
2. Усё лета *за выключэннем некалькіх дзён* было цёплае надвор'е.
3. Шыпшына *або дзікая ружа* належыць да сямейства ружакветкавых.
4. Над горадам *прыбраная ў зоры* апускаецца ноч.
5. Моцна спалі ўсе *акрамя Брагінскага*.
6. *Сын лесніка* я з маленства любіў паліць касцёр, пасядзець ля вогнішча.

(Адказы:1,2,5).

2 узровень. Адзначце нумары сказаў, у якіх няма адасобленых членаў.

1. Алена замест маці навяла парадак у хаце.
2. Гасцей сабралася чалавек пятнаццаць пераважна саслужыўцы гаспадара.
3. Асабліва я не ганюся за сучаснай модай.
4. Не было чутна нават ні гуку.
5. Вярба асабліва яе вецце шырока выкарыстоўвалася ў народным побыце.
6. Я нават адрас яе не помню.

(Адказы: 1, 3, 4, 6).

3 узровень. Складзіце два сказы з адным са слоў *асабліва, нават, пераважна*, каб у першым сказе слова мела ўдакладняльнае значэнне і адасаблялася, а ў другім – не мела ўдакладняльнага значэння (выконвала ролю часціцы).

Самаправерка. Правільныя адказы запісаны на дошцы або слайдзе.

Агучваюцца вынікі самастойнай працы. Абмяркоўваюцца сказы, якія выклікалі цяжкасці.

**7. Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія**

- Вось і заканчваецца наша сустрэча.
- Як вы лічыце, ці справіліся вы з задачамі, пастаўленымі ў пачатку ўрока?
- Якія пытанні ўзніклі ў вас?

**8. Дамашняе заданне**

Вывучыць § 42 і канспект-табліцу, практ. 351 або выпісаць з кнігі, якую вы зараз чытаеце, 3 сказы з адасобленымі дапаўненнямі.